*М. Я. Калацэй (Гродна)*

# ШТАЛАГ 353 – ЛАГЕР ДЛЯ САВЕЦКІХ ВАЕННАПАЛОННЫХ У ВЁСЦЫ КАЛБАСІНА

Неспрыяльны для Чырвонай Арміі характар ваенных падзей у пачатку вайны, у тым ліку і на Гродзенскім напрамку, – хуткае прасоўванне фашысцкіх груповак, бесперапынныя ўдары варожай авіяцыі, жорсткая абарона чырвонаармейцаў, што давала магчымасць нямецкім войскам акружыць буйныя іх канцэнтрацыі, – абумовілі вылікія страты ў людзях, тэхніцы, узбраенні, вялікую колькасць ваеннапалонных.

У аператыўных раёнах з улікам умоў, звязаных з вядзеннем ваенных аперацый, немцы стваралі зборныя армейскія пункты ваеннапалонных і перасыльныя лагеры (дулагі), якія ўвесь час рухаліся бліжэй да лініі фронту. Яны прымалі ваеннапалонных ад вайсковых часцей. У канцы чэрвеня 1941 г. у Гродне быў створаны 9-ы армейскі зборны пункт ваеннапалонных, які ў пачатку ліпеня перадыслацыраваўся ў Бярозу-Картузскую. Тады ж у вёсцы Ласосна (5 км на захад ад Гродна) быў арганізаваны дулаг 125, які існаваў тут да верасня 1941 г., а пазней быў пераведзены ў гарады Міёры, Глыбокае, Полацк. Галоўная задача гэтых зборных пунктаў і дулагаў была ў тым, каб разгрузіць фронт ад ваеннапалонных і пераводзіць іх у тылавыя раёны. Зборныя пункты ваеннапалонных і перасыльныя лагеры прасоўваліся за вайсковымі часцямі з захаду на ўсход, а паток палонных накіроўваўся ў адваротным напрамку да граніц рэйха. У верасні 1941 г. ваенная адміністрацыя перадала ўпраўленне раёнамі, што размяшчаліся ў глыбокім тыле (заходнія раёны Беларусі, гарады Мінск і Слуцк), у рукі цывільнай адміністрацыі. Тут ствараліся стацыянарныя лагеры для ваеннапалонных – шталагі. Шталагі ствараліся, як правіла, на месцы былых дулагаў, прымалі ад іх ваеннапалонных, што засталіся, а надалей – палонных чырвонаармейцаў, што паступалі з усходу.

25 ліпеня 1941 г. было пачата будаўніцтва лагера для ваеннапалонных у вёсцы Калбасіна (побач з чыгуначнай станцыяй Ласосна, гарадскі раён Фолюш). Для будаўніцтва лагера выкарыстоўвалі савецкіх ваеннапалонных, насельніцтва суседніх вёсак, рабочыя атрады яўрэяў з гета. Да лістапада 1941 г. будаўніцтва Шталага 353 у Калбасіне было ў асноўным завершана. Адкрытая прастора плошчай у 50 га была абгароджана калючым дротам у 2 рады, паміж імі – драцяныя загароды і наўкола кулямётныя вышкі. Вязняў размяшчалі ў наспех абсталяваных 96 зямлянках, памер кожнай 6 × 25 м, вышыня 3 м. У зямлянцы – нізкая столь, сцены абабіты дошкамі, доўгія рады двухпавярховых нар. Памяшканне асвятлялася некалькімі квадратнымі акенцамі ў даху пад праходам паміж нарамі. У канцы зямлянкі, апрача акенца ў даху, быў устаноўлены кавалак шкла над дзвярыма. Зямлянка асвятлялася таксама рэдкімі капцілкамі, маленькімі лампадамі з кнотам. У кожнай зямлянцы стаяла маленькая печка з бляхі. Адзінай пабудовай у лагеры, не закапанай у зямлю,

была камендатура, размешчаная ў далёкім канцы лагера. Камендантам Шталага 353 быў Карл Рынтцнер [1, с. 31].

На станцыю Ласосна прыбывалі эшалоны ваеннапалонных, якіх пасля выгрузкі пад канвоем нямецкай аховы накіроўвалі ў лагер. Восенню 1941 г. ваеннапалонныя траплялі ў лагер Калбасіна з раёнаў паланення Беласток–Мінск, Гомель, Вязьма–Бранск. Транспартавалі ваеннапалонных па чыгунцы ў наглуха зачыненых бітком набітых вагонах або на адкрытых платформах. Палонныя гінулі па дарозе ад голаду, смагі, самавольства канваіраў. Зімой замярзалі ад холаду. Тыя, каму ўдалося выжыць у дарозе, прыбывалі ў лагер крайне знясіленыя і схуднелыя.

З пачатку 1942 г. колькасць савецкіх воінаў, што траплялі ў нямецкі палон, рэзка зменшылася, таму значна скарацілася колькасць транспарту з усходу. Але з сакавіка 1942 г. павялічылася адпраўка ваеннапалонных, што перажылі зіму 1941–1942 гг., у канцэнтрацыйныя лагеры на тэрыторыі генерал-губернатарства Польшчы, Германіі. У адпаведнасці з загадам камандуючага вермахта «Остланд» ад 20 верасня 1941 г. на тэрыторыі генеральнай акругі Беларусь быў прызначаны акруговы камендант лагераў ваеннапалонных. Ім быў падпалкоўнік Вольтке, з рэзідэнцыяй у Мінску (Шталаг 352 – Пушкінскія казармы). У яго падпарадкаванні знаходзіўся і шталаг 353 у Калбасіне [3, с. 68].

Ахову лагера неслі войскі вермахта. Унутранае кіраванне і нагляд за ваеннапалоннымі ажыццяўлялі паліцэйскія з саміх ваеннапалонных. Ваеннапалонныя заставаліся ў той самай форме, у якой яны трапілі ў палон. Прыдатныя зімовыя адзенне і абутак ахоўнікі адбіралі. Афіцэры армейскай контрразведкі і камандаванне лагера выяўлялі палітработнікаў, камуністаў, камандзіраў і знішчалі іх. У лагеры былі жахлівыя антысанітарныя ўмовы (адсутнасць вады для мыцця, мыла, зменнай бялізны), якія сталі прычынай вашывасці. Гэтаму спрыяла і страшэнная цесната. Вельмі дрэннае было харчаванне. Хлеб толькі напалову, а часцей і таго меней, складаўся з паўнацэннай жытняй мукі; у яго дадавалі апілкі, лісце дрэў і іншыя дамешкі.

Палонныя раз у суткі атрымлівалі баланду-поліўку з бульбянога шалупіння, гнілой ці мёрзлай капусты, буракоў. Такі рацыён забіваў не горш за кулю. У лагеры адчуваўся вострый недахоп пітной вады. У крайняй ступені схуднелыя людзі ўяўлялі з сябе шкілет, абцягнуты скурай. Мышачных тканак амаль не заставалася. Усё гэта вяло да масавай смяротнасці ваеннапалонных.

Зімой 1941–1942 гг. у лагеры панавалі эпідэміі сыпнога тыфу, дызентэрыі. Ад дызентэрыі амаль усе паміралі. Дрэннае харчаванне толькі паскарала гібель. Калі ў зямлянцы ўзнікалі выпадкі сыпнога тыфу, каранцін накладвалі на ўвесь блок, які складаўся з чатырох зямлянак. У такіх выпадках

хварэлі, як правіла, усе, хто там знаходзіўся, мала хто заставаўся жывы. Памерлых ваеннапалонных выносілі ці вывозілі на калясках за агароджу лагера, скідвалі ў загадзя выкапаныя восенню траншэі. Магілкі знаходзіліся на захад ад лагера на адлегласці 260 метраў. У першыя часы існавання лагера памерлых хавалі па адным, па пяць, дзесяць чалавек у адну магілу. Зімой

1941–1942 гг. хавалі ў агульных магілах-траншэях. На тэрыторыі лагера вы-яўлена 68 магіл, кожная памерам 33 × 6 м, глыбінёй 2 м, у якіх пахавана ка-18 тыс. чалавек [2, с. 14]. Колькасць ваеннапалонных да вясны 1942 г. зна-скарацілася ў выніку масавай смяротнасці зімой 1941–1942 гг., а з сакаві-1942 г. пачаўся ўзмоцнены вываз працаздольных палонных на працу ў Гер-манію.

Праца ваеннапалонных выкарыстоўвалася і на работах у лагеры, і па-лагерам у складзе рабочых каманд. Унутрылагерная лічылася праца па буд-ніцтве і расшырэнні лагера, кравецкая, шавецкая і іншая праца па абслуго-ванні аховы лагера і ваеннапалонных. З ваеннапалонных фарміраваліся рабо-чыя атрады па спецыяльнасцях, якія рэгулярна пад узмоцненай аховай нак-роўваліся на аб'екты працы (аўтарамонтныя майстэрні, пагрузачна-разгрузач-ныя работы, нарыхтоўка лесу).

Ваеннапалонныя працавалі асобна ад мясцовых цывільных рабочых. Ка-не дапусціць распаўсюджвання сярод іх інфармацыі пра становішча на фра-тах і партызанскім руху, забаранялася сувязь з мясцовым насельніцтва-Пад пагрозай растрэлу забараняліся кантакты з палоннымі і мірнаму насель-ніцтву, перадача харчавання, адзення.

Каб прадухіліць іх уцёкі, вялася строгая ахова лагера і строгі нагляд за па-лоннымі ў час руху на працу і на рабочых месцах. Пры спробе ўцёкаў іх рас-стрэльвалі ў прысутнасці ўсіх ваеннапалонных лагера з абвяшчэннем прыга-вору і прычыны, трупы не закопваліся па некалькі дзён. З лета 1942 г. уцё-з лагера павялічыліся, асабліва з рабочых каманд. Загадамі камандавання сі-ламі «Остланд», начальніка паліцыі бяспекі і СД Беларусі прадпісваліся най-стражэйшыя меры па ўзмацненні рэжыму аховы і ўзмацненні адказнасці ахоў-ных службаў за ўцёкі палонных.

На пачатак лістапада 1942 г. ваеннапалонных у лагеры ў Калбасіне ўж-не было. Лагер стаў функцыянаваць як транзітны лагер СС, праз які гітлераўц-ажыццяўлялі прымусовы вываз зняволеных гета з Гродна, мястэчак Гродзен-скага павета і прылягаючых да яго паветаў Беластоцкай акругі ў лагер-смерці Трэблінку, Майданэк і Асвенцым. З-за недахопу транспарту для ад-праўкі вязняў гета ў Польшчу нацысты размясцілі іх у былым лагеры дл-савецкіх ваеннапалонных у Калбасіне. У лагеры быў створаны і ажыццяўля-дзейнасць юдэнрат (яўрэйскі савет). Аднак гэты лагер не лічыўся гета. У афі-цыйных дакументах нямецкіх акупацыйных улад гаворка ідзе аб двух гро-дзенскіх гета. Лагер у Калбасіне выконваў функцыі перасыльнага. На пачатк-снежня 1942 г. сюды было дастаўлена каля 10 тыс. чалавек з мястэчак Гродзен-скага павета, звыш 14 тыс. з гета іншых паветаў і 5 тыс. з гета Гродна [2, с. 14]. Зняволеныя знаходзіліся ў зямлянках, якія не апальваліся. У лагеры пачаліся эпідэміі дызентэрыі і тыфу, а следам за імі – масавая смяротнасць, самагуб-ствы. Штодзённа на тэрыторыі лагера хавалі 30–40 чалавек, якіх знішча-камендант лагера Карл Рынтцнер і ахоўнікі. У сярэдзіне снежня пачалася адпраўка вязняў Калбасіна праз чыгуначную станцыю Ласосна ў лагеры зні-

шчэння Трэблінку, Майданэк і Асвенцым. На працягу тыдня з лагера адправілі амаль усіх зняволеных. Застаўшыхся, каля 3 тыс. чалавек, перавялі ў Гродна. Транзітны лагер СС у Калбасіне існаваў да вясны 1943 г. [4, с. 44].

Паводле звестак Надзвычайнай дзяржаўнай камісіі па расследаванні і устанаўленні злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў на акупіраванай тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, у Шталагу 353 было знішчана 18 тыс. савецкіх ваеннапалонных.

У лютым і лінені 2008 г. адбылося перапахаванне астанкаў 1702 салдат Чырвонай Арміі. Цырымонія адбылася на гарадскіх могілках у Аўльсе. На месцы былога нямецкага лагера для ваеннапалонных у раёне вайсковай часці ў мікрараёне Фолюш салдаты 52-га асобнага спецыялізаванага батальёна правялі пошукавыя работы. Тады і былі знойдзены астанкі савецкіх воінаў. З цягам часу на могілках Аўльс з'явіцца мемарыял загінуўшым у гады Вялікай Айчыннай вайны.

### КРЫНІЦЫ І ЛІТАРАТУРА

1. Национальный архив РБ (НА РБ), ф. 845, оп. 1, д. 8. Материалы Чрезвычайной Государственной комиссии о злодеяниях немецко-фашистских захватчиков.
2. НА РБ. ф. 845, оп. 1, д. 11.
3. НА РБ. ф. 4683, оп. 3, д. 917.
4. Documents Concerning the Destruction of the Yews of Grodno. – T. I–V – T. 1.

*А. А. Носова (Гродно)*

## УГОН ЖИТЕЛЕЙ БЕЛАРУСИ В ГЕРМАНИЮ И ВОЗВРАЩЕНИЕ ИХ НА РОДИНУ В ПОСЛЕВОЕННЫЙ ПЕРИОД

После контрудара советских войск под Москвой осенью 1941 г., когда призывы в немецкую армию коснулись и ядра производственных коллективов Германии, увеличилось число заказов предприятий биржам труда на рабочие руки. Недостаток рабочих грозил крупными неприятностями военной экономике. 31 октября 1941 г. А. Гитлер отдал распоряжение об использовании в широких масштабах труда советских военнопленных. Кроме того, в качестве рабочей силы решено было использовать жителей оккупированных территорий СССР [2, с. 22]. Оккупационные власти создали на территории Беларуси централизованный аппарат, который занимался вербовкой и угоном населения на работы в Германию и союзные ей страны.

Первоначально для вербовки белорусских граждан использовались средства пропаганды: устные и радиовыступления о жизни в Германии, оборудовались фотовитрины, печатались статьи в газетах, распространялись листовки, плакаты, демонстрировалась кинохроника. Точных сведений о количестве выехавших в Германию добровольцев нет. По предварительным подсчетам